Необходимо скорее отходить от таких приёмов, как умолчание, дозирование информации, однобокий подход к осмыслению фактов и явлений.

- регулярное освещение в СМИ результатов соцопросов, анкетирования среди населения по актуальным вопросам правовой культуры, широкое внедрение в работу масс-медиа методов дата-журнализма;
- важно также в прессе систематически отслеживать действенность принципа открытости деятельности судов, в том числе открытости судебных заседаний, проведения выездных судов, показывать участие в уголовном процессе общественного обвинителя и общественного защитника, участие граждан при отправлении правосудия, что выступает надежным индикатором его подлинной демократичности и прозрачности.

Улучшение качества деятельности правовой журналистики позволит повысить и аналитико-критический подход экспертного сообщества к изменениям в судебно-правовой сфере, личную заинтересованность граждан в конечных результатах и их ответственность за построение правового государства и сильного гражданского общества.

Устойчивому правовому просвещению служит и обеспечение доступа для всех журналистов и редакций СМИ к передовым информационно-коммуникационным технологиям, высокоскоростному интернету. Для журналистов данной специализации необходимы постоянно действующие курсы и тренинги по переподготовке и повышению квалификации, что обеспечит не только обмен опытом, совершенствование профессионального мастерства, но и служит формированию их корпоративной правовой культуры. На факультетах и отделениях журналистики вузов давно назрела необходимость разработки учебных планов и программ магистратуры, соответствующей потребностям и специфике правовых СМИ как традиционного, так и нового формата. Остро востребованы кадры, способные оперативно и качественно работать в жанрах судебного репортажа и журналистского расследования.

# САЦЫЯЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ ПАШЫРЭННЯ П'ЯНСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ ПАЧАТКУ XX СТ.

# SOCIAL ASPECTS OF DRUNKENNESS ON THE TERRITORY OF THE BELARUSIAN PROVINCES AT THE BEGINNING OF 20TH CENTURY

***С. В. Мяньчэня***

***S. Myanchenya***

*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*men_sv@tut.by*
*Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Republic of Belarus*

Сістэма дзяржаўнай «віннай» манаполіі значна паўплывала на культуру спажывання алкагольных напояў на тэрыторыі Беларусі і зрабіла гарэлку даступнай для розных груп насельніцтва. Сярод сацыяльных прычын росту п'янства ў пачатку XX ст. можна вылучыць разбурэнне сістэмы грамадска-сямейнага кантролю, рост гарадскога насельніцтва, незадаволенасць існуючым ладам, адсутнасць упэўненасці ў будучыні.

The State «wine» monopoly system had a significant impact on the culture of consumption of alcoholic beverages in Belarus and made vodka available to the various population groups. Among the social reasons for the increase of alcoholism in the early twentieth century. you can determine the destruction of the system of social and family control, the growth of urban population, dissatisfaction with the existing system, the lack of confidence in the future.

*Ключавыя словы:* вінная манаполія, вулічнае п'янства, корчмы

*Keywords:* wine monopoly, street drinking, pubs

У 1897 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў была ўведзена сістэма «віннай» манаполіі, якая перадавала вытворчасць і гандаль гарэлкай у рукі дзяржавы. Рэалізацыя дадзенай сістэмы суправаджалася ліквідацыяй корчмаў, якія разглядаліся, як асноўная прычына п'янства, стварэннем густой сеткі казённых крам – манаполек і падтрымкай ідэі памеранага спажывання алкаголя.

Адной з галоўных ідэй манаполіі было насычэнне рынку легальным, якасным алкаголем для змяншэння ролі нелегальнага гандлю. Даступнасць гарэлкі рабіла продаж алкагольных сурагатаў невыгадным. У першыя гады існавання манаполіі фіксавалася дастаткова нязначная колькасць правапарушэнняў у гэтай сферы. Больш пашыранай з'явай з'яўлялася спекуляцыя – перапродаж гарэлкі, пераважна ў начны час, але асаблівага прыбытку дадзеная справа не прыносіла. Спекуляцыя не вельмі клапаціла дзяржаву, бо гарэлка ўсё ж куплялася ў манапольках, іншай справай былі таемныя корчмы. Пад гэту катэгорыю траплялі як былыя корчмы, якія працягнулі сваю дзей-

насць пад шыльдай чайных ці закусачных, так і хаты гаспадароў, якія дазвалялі прыезджым і мясцовым распіваць спіртныя напоі. Барацьба з гэтай з'явай фактычна падмяняла ідэю барацьбы з п'янствам і асаблівага поспеху, акрамя фіскальных прыбыткаў дзяржаве за кошт штрафаў, не прыносіла. Шкодным сталася і распаўсюджванне ідэі памеранага спажывання алкаголю. П'янства абвяшчалася злом, толькі тады, калі пілі праз меру, што прывяло да фарміравання паблажлівых адносін як да алкаголю, так і саміх аматараў гарэлкі.

Ліквідацыя традыцыйнай карчмы прывяла да значных змен ў традыцыі спажывання алкаголю. Карчма была не проста харчова-піцейнай установай, яна з'яўлялася месцам сустрэч, баўлення вольнага часу. Кантынгент карчмы рэгуляваўся сістэмай традыцыйных грамадска-сямейных адносін, якая абмяжоўвала доступ да гарэлкі жанчын, моладзі і дзяцей. Новая сістэма здымала гэтыя абмежаванні ў дачыненні да першых двух катэгорый.

Лічылася, што вынасны гандаль будзе спрыяць хатняму спажыванню, пад кантролем сям'і, але вынікам гэтага стала распаўсюджванне вулічнага п'янства. Гарэлку спажывалі часта тут жа каля крамы, з бутэлькі, без закускі, тым больш што гэтаму садзейнічалі бутэлькі малых памераў – «соткі» (120 г) і «кручкі» (60 г). Па трапным выразе Юрыя Верашчакі (адзін з псеўданімаў Вацлава Ластоўскага) – «настаў час астраномаў» [1], а звычка спажываць алкаголь такім чынам захавалася і ў наш час. Акрамя непасрэднай шкоды для чалавека, які спажывае, вулічнае п'янства нясе яшчэ адну пагрозу – робіць спажыванне алкаголю адкрытым, бачным для іншых, павялічвае шансы сустрэчы, не заўсёды прыемнай з нецвярозым чалавекам. Шматлікія крыніцы паведамляюць і пра пашырэнне п'янства сярод дзяцей, прычым у большасці выпадкаў гарэлку яны каштавалі, дзякуючы бацькам дома [2, с. 79].

Асабліва востра пытанне росту п'янства стаяла ў гарадах. У сельскай мясцовасці насельніцтва, у пераважнай большасці, без уліку маргінальных элементаў, спажывала алкаголь па святах, ды з нагоды значных падзей. Штодзённае п'янства было немагчымым з прычыны неабходнасці вядзення гаспадаркі і недахопу сродкаў. Перад селянінам, асабліва ў перыяд актыўных гаспадарчых работ, праблема баўлення вольнага часу не з'яўлялася вельмі актуальнай, з прычыны адсутнасці апошняга. Гараджане і мястэчкоўцы, асабліва з пралетарскай праслойкі, хатніх работ былі пазбаўлены, а даступнасць гарэлкі і адсутнасць танных магчымасцей здаровага баўлення вольнага часу спрыялі росту спажывання алкаголю. У гарадскім асяроддзі часта адсутнічалі і сямейныя абмежаванні, аўтарытэт бацькі-патрыярха ва ўмовах малой сям'і, якая пераважала ў гарадах, не дзейнічаў. Новыя ўмовы жыцця вызначалі новае асяроддзе, звычкі, дзе алкаголь рабіўся звычайнай з'явай.

Значна павялічылася спажыванне алкаголю пасля 1907 г. Некаторыя тагачасныя беларускія дзеячы (Язэп Лёсік, Цішка Гартны) звязвалі гэта са своеасаблівым сацыяльным пратэстам, які быў выкліканы крушэннем надзей на пазітыўныя змены ў жыцці, якія нарадзіліся падчас рэвалюцыі: *«Покі існуе такі парадак, дзе людзям і тхнуць нельга, покі і праменні радасці блішчаць толькі ў гарэлцы, да той пары шынкі не звядуцца, нават калі на ўсім свеці іх закрыць – няма карысці»* [3]. Рост п'янства суправаджаўся ростам пашырэннем азартных гульняў, хуліганства і ўзмацненнем сацыяльнай напружанасці ў грамадстве.

Праблема алкагалізацыі грамадства актуальна і ў пачатку XXI ст. Вывучэнне ранейшага, хай і не зусім удалага, вопыту арганізацыі барацьбы з п'янствам можа дапамагчы ў распрацоўцы новых праграм і засцерагчы ад памылак мінулага, тым больш, што тут назіраюцца яскравыя паралелі. Сёння ўжо параўнанне спажывання алкаголю паміж горадам і вёскай, у адрозненне ад мінулага стагоддзя, будзе не карысць апошняй, але шмат якія з'явы – вулічнае п'янства, паблажлівыя адносіны да алкаголю, адсутнасць сацыяльнага кантролю і ўпэўненасці ў будучым застаюцца актуальнымі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Верашчака, Юры* Крыху з гісторыі п'янства / Юры Верашчака // Наша Ніва. – 1914. – 1 мая. – С. 2–3.
2. *Багдановіч, А. І.* Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі (1861–1900 гг.) / А. І. Багдановіч. – Мінск: БНТУ, 2012. – 153 с.
3. *Язэп, Л.* Дык што ж рабіць? / Лёсік Язэп // Наша Ніва. – 1913. – 26 крас. – С. 1.

## ВИРТУАЛЬНОЕ ИСКУССТВО В СОЦИАЛЬНО-КОММУНИКАЦИОННОМ ПРОСТРАНСТВЕ

## VIRTUAL ART IN SOCIAL COMMUNICATION SPACE

***С. С. Мишук***
***S. Mishuk***

*Белорусский государственный университет, МГЭИ им. А. Д. Сахарова БГУ, г. Минск, Республика Беларусь*
*mishuk_siarhei@inbox.ru*
*Belarusian State University, ISEI BSU, Minsk, Republic of Belarus*

Анализируются вопросы функционирования цифрового искусства как элемента системы инфокоммуникационных технологий. Последнее рассматривается в качестве формирующегося структурного